Сябра, не зьдзіўляйся, але цяпер толькі ад **ЦЯБЕ** залежыць лёс **ТВАЁЙ** краіны.

## **9 верасьня** будуць выбары.

## **ТЫ** будзеш абіраць прэзыдэнта.

9.09.2001
9.09.2001
9.09.2001
9.09.2001

Думаеш, ужо ўсё вырашана? Не. Ты, я, усе мы павінны прагаласаваць, каб ніхто не зрабіў гэтага за нас.

**ВЫБІРАЙ**

Мы заўсёды выбіраем, што нам больш даспадобы – тэлевізійны канал, ці музыку, ці гатунак піва, ці куды паехаць адпачываць. Гэтак і з прэзыдэнтам. 9 верасьня трэба абавязкова зрабіць выбар. Мы абярэм нармальнага прэзыдэнта і больш ня будзем злавацца, што нейкія людзі абралі не таго.




**Навошта ісьці на выбары?**

1. Таму што ўсе людзі прагнуць ***свабоды***. Яшчэ ад савецкіх часоў нам засталася безьліч забаронаў. Візы, прапіска, разьмеркаваньне пасьля ўнівэрсытэта. Табе гэта трэба?

2. Таму што ты хочаш мець любімую і добра аплатную ***работу*** – у Беларусі, а не на чужыне. Але ж яшчэ з савецкіх часоў у нас на вытворчасьці не мянялі абсталяваньне, усё абяцалі, што Беларусь пойдзе нейкім "сваім шляхам". Калі так будзе далей, эканоміка разваліцца зусім, шмат нармальных людзей будуць вымушаныя зьехаць з краіны. Цябе гэта не пужае?



3. Таму што ***сям'я*** – гэта найбольш блізкае і роднае для чалавека. Але яшчэ з савецкіх часоў у маладой сям'і ні на што не хапае грошай. Няма як займець уласную кватэру, уладкаваць дзяцей у нармальную навучальную ўстанову. Сям'і пагражае "дзяржаўнае п'янства". Ці не зашмат праблемаў?



4. Таму што ты ня хочаш, каб усіх хлопцаў агулам забіралі ў войска. Яшчэ з савецкіх часоў нам даводзілі, што НАТО – гэта "ворагі", што "ворагі" ўсюды. Але ж ***ніхто з намі не зьбіраецца ваяваць***, нікому мы ня трэба! Тымчасам нашыя салдаты "батрачаць" на дачах начальнікаў ды ў развалепных калгасах. А пра дзедаўшчыну і ўвогуле ходзяць розныя страшэнныя гісторыі. Ці табе патрэбна такое войска?

5. Таму што сёньня табе страшна прыйсьці да доктара. Яшчэ з савецкіх часоў некаторыя хваробы наша "бясплатная" мэдыцына ня лечыць. Трэба прыходзіць са сваімі лекамі, насіць доктару цукеркі й грошы, каб для цябе былі ***чалавечыя адносіны***. Ці гэта мэдыцына?

# ВЫБІРАЙ

Калі ў цябе пакуль усё добра і ты ня хочаш ісьці галасаваць, ведай: тваю будучыню за цябе выберуць пэнсіянэры, якія жывуць успамінамі пра савецкія часы.

Памятай, заканадаўства зроблена так, што толькі 9 верасьня назіральнікі на выбарчых участках змогуць рэальна пракантраляваць правільнасьць галасаваньня.

І яшчэ. Ты ня пойдзеш галасаваць, а хтосьці замест цябе расьпішацца і ўкіне выбарчы бюлетэнь у скрынку. Не аддавай свой голас нікому! Паспрабуй 9 верасьня зрабіць нашу краіну нармальнай.




9.09.2001



## Далучайся!

ВЫБІРАЙ
09.09.2001



## Ты выбіраеш сам